**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2016 г.**

## Мерапрыемствы да 30-годдзя Чарнобыльскай трагедыі

**20 красавіка**

Інфармацыйная гадзіна – рэквіем «Моей земли Чернобыльская рана» адбылася ў інфармацыйна – сэрвісным цэнтры для вучняў школы № 3, прысвечаная Дню памяці Чарнобыльскай трагедыі. Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі расказалі навучэнцам аб трагедыі на Чарнобыльскай АЭС і подзвіге людзей – ліквідатараў аварыі. Мерапрыемства суправаджалася электроннай прэзентацыяй «Чернобыль: взгляд сквозь годы».

ЦБ, 56 чал.

**22 красавіка**

Урок памяці «Чернобыль – наша боль» прайшоў для навучэнцаў сельскай школы. Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «Чернобыль – быль, Чернобыль – боль». Вядучыя мерапрыемства расказалі гледачам аб трагедыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, аб людзях, ахвяраваўшых сваім здароўем і жыццём. Усе прысутныя ўшанавалі памяць загінуўшых хвілінай маўчання.

Навасёлкаўская СБ, 60 чал.

**24 красавіка**

Вечар – рэквіем "У чорных промнях палыновай зоркі" адбыўся з удзелам аматарскага клуба "Крыніца". Удзельнікі пасяджэння пазнаёміліся з кароткай храналогіяй падзей тых гадоў, прагледзелі відэапрэзентацыю "Трагедыя Чарнобыля". Пад час мерапрыемства гучалі вершы пра Чарнобыль беларускіх і рускіх аўтараў. Завяршыўся вечар хвілінай маўчання, у памяць аб загінуўшых у катастрофе на Чарнобыльскай АЭС.

Гарадзецкая СБ, 21 чал.

## Мерапрыемствы да Сусветнага Дня здароў'я

**6 красавіка**

Для навучэнцаў "Кобрынскага палітэхнічнага каледжа" адбылося выступленне ЛПГ "Рытм" "Пусть всегда будет завтра!" Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі падрыхтавалі інфармацыю пра негатыўны ўплыў псіхаактыўных рэчываў, прапанавалі відэаролік. На мерапрыемствы выступіў настаяцель Свята – Петра - Паўлаўскага храма г. Кобрына айцец Аляксандр.

ЦБ, 52 чал.

**7 красавіка**

На інфармацыйны марафон "Формула здароўя" сабраліся вучні 4 – 8 класаў. Дзеці зрабілі невялікі экскурс у гісторыю тытуню "З чаго ўсё пачыналася", бралі ўдзел у гульнях, віктарынах "Ці ведаеце вы", "Закончы прыказку", конкурсе слоганаў і крычалак пра здаровы лад жыцця. Галоўнай мэтай мерапрыемства было фарміраванне адмоўнага стаўлення дзяцей да шкодных звычак.

Арэхаўская СБ, 30 чал.

**12красавіка**

Для навучэнцаў старэйшых класаў СШ №1 адбылося выступленне літаратурна – паэтычнай групы “Рытм” з праграмай па здароваму ладу жыцця “Три ступени, ведущие вниз”. На мерапрыемствы прадэманстраваны фільм «Пусть беда минует тебя», падрыхтавана кніжна – ілюстраваная выстава «Сохраним себя для жизни».

ЦБ, 54 чал.

**17 красавіка**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры і аўтаклубам арганізавалі гадзіну здароўя «Здоровьем дорожить умейте». Да мерапрыемства падрыхтавана кніжная выстава «Путь в страну здоровья». Удзельнікі з задавальненнем праглядзелі прапануемую відэапрэзентацыю, прынялі актыўны ўдзел у гульнях і віктарыне. Народная музыка і песні падарылі добры настрой прысутным у зале. У канцы мерапрыемства для выхаванцаў дзіцячага сацыяльнага прытулка арганізаваны салодкі стол.

Восаўская СБ, 40 чал.

**22красавіка**

На стадыёне школы бібліятэка арганізавала і правяла спартыўна – гульнёвую праграму «Спорт – это здорово!». Удзел у эстафетах, гульнях і конкурсах прынялі вучні малодшых класаў. У ходзе мерапрыемства рабяты атрымалі вялікі зарад бадзёрасці і масу добрых эмоцый.

Болотская СБ, 12 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**1 красавіка**

Дзень праваслаўнай кнігі «В поисках святого и вечного» прайшоў у сельскай бібліятэцы. Да ўдзелу запрошаны прадстаўнікі праваслаўнага руху ў ахову традыцыйных сямейных каштоўнасцей «Настоящая жизнь» ад Свята – Васкрэсенскага храма г. Брэста. Госці пазнаёмілі рабят з гісторыяй праваслаўнай кнігі, з сучаснай праваслаўнай літаратурай, з царкоўна – славянскай мовай, правялі віктарыну. Айцец Сергій паказаў самыя старыя кнігі, якія захаваліся ў Свята - Петра – Паўлаўскай царкве г. Кобрына.

Залеская СБ, 60 чал.

**20 красавіка**

Віртуальнае падарожжа ў космас “В безбрежном времени Вселенной”, прымеркаванае да Дня касманаўтыкі і 55-годзю палёта першага чалавека ў космас. Да мерапрыемства падрыхтавана відэапрэзентацыя з дапамогай якой, дзеці даведаліся аб гісторыі ўзнікнення свята. Новыя веды юныя наведвальнікі мелі магчымасць праявіць у займальных гульнях, віктарынах і конкурсах. Бібліятэкар прапанавала рабятам атрымаць больш інфармацыі аб заваяванні космаса, дасягненні касманаўтыкі, героях – касманаўтах, загадках Сусвету з кніг, прадстаўленных на выставе "Удивительный мир космоса".

Хабовіцкая СБ, 25 чал.

**25 красавіка**

У інфармацыйна – сэрвісным цэнтры адбыўся майстар – клас «Оформление библиотек с использованием компьютерных технологий». Ідэямі афармлення бібліятэчнай прасторы падзяліліся загадчыца аддзелам бібліятэчнага маркетынгу і спецыялісты сельскіх публічных бібліятэк. Усе выступленні суправаджаліся мультымедыйнай прэзентацыяй.

ЦБ, 50 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

Бібліёграфамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі выдадзены рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік "Ахоўная прыродная тэрыторыя – балота Званец". Гэта 3-ці выпуск бібліяграфічных выданняў з цыкла "Па старонках календара нашай памяці".

Выканаўца Раманюк Н. В.
Тэл. 2 36 81